# З УСМЕШКАЙ ШЧЫРАЙ ПА ЖЫЦЦІ

**_Інтэлігентны, добразычлівы, сумленны, адказны, ветлівы… Такім прывыклі бачыць студэнты і калегі Васіля Мікалаевіча БАРАНКА, дацэнта кафедры карэкцыйнай работы, кандыдата педагагічных навук, дацэнта. У нашым універсітэце выкладчык працуе ўжо 45 гадоў._**

## СТАНАЎЛЕННЕ ПЕДАГОГА

*Нарадзіўся Васіль Мікалаевіч у горадзе Сянно Віцебскай вобласці ў сям'і рабочых. Бацькі трымалі гаспадарку, а ён ім заўсёды дапамагаў. Юнаком актыўна займаўся рознымі відамі спорту, пастаянна выступаў на спаборніцтвах за сярэднюю школу №2, у якой вучыўся.*

*Любімым школьным прадметам у будучага настаўніка была фізіка. Таму невыпадкова, што ў 1965 годзе ён паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава.*

*«Вучыцца мне вельмі падабалася. Асабліва запомнілася, як я прымаў удзел ва Усесаюзным слёце студэнтаў. Таксама ў маёй памяці засталіся паездкі ў калгас. Тады мы выязджалі надоўга, амаль на цэлы месяц. А калі я вучыўся на другім курсе, то нават замест выкладчыка разам з першакурснікамі адправіўся на сельскагаспадарчыя работы. Цудоўная была пара», – адзначыў Васіль Мікалаевіч.*

*Пасля заканчэння інстытута ў 1969 годзе выкладчык пайшоў у армію. А пасля таго, як вярнуўся, працаваў настаўнікам фізікі ў сярэдніх школах №2 і №3 г. Віцебска. І тады вырашыў працягнуць вучобу. З 1976 года працаваў асістэнтам кафедры педагогікі ВДПІ імя С.М. Кірава. У 1980-м скончыў аспірантуру Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (спецыяльнасць «Гісторыя і тэорыя педагогікі»). І ў тым жа годзе абараніў дысертацыю. У 1981-м Васілю Баранку была прысуджана вучоная ступень кандыдата педагагічных навук, у 1987-м – прысвоена вучонае званне дацэнта.*

## ПРА МАСТАЦТВА ВЫХАВАННЯ І НЕ ТОЛЬКІ

*З 2007 года Васіль Мікалаевіч працуе дацэнтам кафедры карэкцыйнай работы нашага ўніверсітэта.*

*«Я ўпэўнены, што студэнтаў трэба любіць. Мае заняткі ў большай ступені маюць практычную накіраванасць. Я вучу студэнтаў, як правільна пісаць канспекты, запаўняць рабочыя сшыткі, а яшчэ яны рыхтуюць рознапланавы наглядны матэрыял з дапамогай сучасных тэхналогій. Хлопцы і дзяўчаты ўжо ведаюць, як правільна зайсці ў аўдыторыю, сесці і павітацца. Гэта таксама цэлая навука. Стараюся выхоўваць з маладых людзей інтэлігентаў», – расказаў Васіль Баранок.*

*Дарэчы, з педагагічнай дзейнасцю звязаны ўсе члены сям'і выкладчыка. Яго жонка Ларыса Рыгораўна шмат гадоў працавала настаўніцай у сярэдняй школе № 11 г. Віцебска. Старэйшая дачка Святлана – настаўніца рускай мовы і літаратуры ў віцебскай гімназіі №8, малодшая Алена – выхавацель у дзіцячым садзе № 97. Толькі любімы ўнук Яўген выбраў для сябе іншы род заняткаў. Ён студэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.*




**Васіль Мікалаевіч з дачкой Святланай і ўнукам Яўгенам.**

*А яшчэ Васіль Баранок з'яўляецца старшынёй Савета ветэранаў і кіраўніком музея гісторыі педагагічнага факультэта, таму вольнага часу ў выкладчыка мала.*

*У выходны дзень Васіль Мікалаевіч аддае перавагу прагулкам на свежым паветры. Улюбёны маршрут выкладчыка – да помніка А.С. Пушкіну, куды ён раней хадзіў разам са сваім унукам.*

*У гэтым месяцы Васіль Баранок адзначыў свой юбілейны дзень нараджэння і адказаў на пытанні нашай анкеты.*

**Назавіце вашы асноўныя станоўчыя якасці і недахопы.**

Мае асноўныя станоўчыя якасці – працалюбства, педантызм і тое, што я ва ўсім выступаю як заядлы эстэт. Гэтыя якасці часцей за ўсё з'яўляюцца і маімі недахопамі.

**На якога героя з літаратуры, кінафільма або мультфільма вы хацелі быць падобнымі ў дзяцінстве?**

У дзяцінстве я хацеў быць падобным на маладога вучонага, фізіка-ядзершчыка Гусева, якога ў карціне «Дзевяць дзён аднаго года» Міхаіла Ромма сыграў Аляксей Баталаў. Падчас аднаго са сваіх эксперыментаў герой фільма атрымаў смяротную дозу радыяцыі, але працягнуў свае навуковыя пошукі.

**Якую дзіцячую мару вам удалося ўвасобіць у жыццё, а якую – не? Чаму?**

Усё жыццё мне хацелася вучыцца, каб стаць сапраўдным вучоным. Але гэта мара споўнілася толькі напалову. Была ідэя напісаць сваю аўтарскую педагогіку. І я ўпэўнены, што, калі пайду на пенсію, абавязкова завяршу пачатае.

**Якім дасягненнем у жыцці вы ганарыцеся больш за ўсё?**

Я ганаруся тым, што ў мяне ёсць такія высокія жыццёвыя мары, дасягнуўшы якіх я змагу ўнесці вялікі ўклад у выхаванне беларускага народа.

**Аб якім сваім учынку або рашэнні вы шкадуеце?**

Я лічу, што мала ўвагі ўдзяляю сваім бацькам, хаця вельмі часта прыязджаю да іх у госці, на святы. Шкада, што ўжо нічога не зменіш.

**Самы каштоўны савет, які вы атрымалі ў жыцці.**

Аднойчы прафесар А.І. Кочатаў даў мне параду, як дасягнуць сваёй мары: «Ідзі да людзей, грукай у дзверы – і табе адчыняць».

**Назавіце здольнасць, якой вы хацелі б валодаць.**

Я хацеў бы ўмець творча працаваць у любой абстаноўцы, а не толькі ў спрыяльных умовах.

**Што б вы ніколі не зрабілі ў сваім жыцці?**

Я б ніколі не зрабіў бы шкоды іншым людзям.

**Вікторыя ЧАКУШКА.**